# ИСТОРИЯ. ФИЛОСОФИЯ. ПОЛИТОЛОГИЯ

**УДК 394.6 (476)**

## КІРМАШЫ Ў СТРУКТУРЫ САЦЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ І АБРАДНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX–ПАЧАТКУ XX ст.)

***К. А. АНТОНАВА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. наук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*У мінулым кірмаш з’яўляўся адной з самых важных падзей у грамадстве. Купцы прыязджалі з розных гарадоў, прадавалі тавары, а таксама куплялі мясцовыя. Людзі маглі абменьвацца навінамі, прымаць удзел у гандлёва-гульнявых, відовішчных і масава-гульнявых дзеяннях. У артыкуле разгледжана месца і роля кірмашоў у сацыяльную культуру і абраднасці беларусаў Падзвіння на аснове матэрыялаў другой паловы XIX – пачатку XX ст.*

**Сімвалічныя аспекты кірмашу і яго сацыяльная культура.** Кірмаш уключае ў сябе не толькі функцыю тавараабмену, але і таксама нясе ў сабе сімвалічныя аспекты, якія адлюстроўваюцца ў традыцыйнай культуры грамадства. Даволі цікавым з’яўляецца тое, што нават выправа на кірмаш суправаджалася разнастайнымі магічнымі прадпісаннямі і засцярогамі. На Беларускім Падзвінні існавала павер'е, згодна з якім нованароджаных можна было «прадаць» калі ў мужа і жонкі дрэнна раслі дзеці. «Прадавалі» пераважна суседзям альбо сябрам, а пасля выкуплялі за сімвалічную суму ў некалькі капеек, а здзелку святкавалі выпіваннем гарэлкі. Дзіця, які застаўся разам з роднымі бацькамі, лічыўся «часовым таварам», а падобны рытуал, згодна з мясцовым паданнях, адпуджваў ад дзяцей хваробы [7, с. 15].

Адной з асаблівасцяў кірмашу з'яўляецца высокая канцэнтраванасць розных этнасаў і сацыяльных груп. Арганізацыя рознага роду форм кірмашу дае магчымасць прыцягнуць вялікую колькасць людзей да аднаго дзейства, а таксама спрыяе жыццярадаснаму настрою у гледачоў. Аб тэрміне і дні свята, як правіла, ведалі не толькі навакольныя сяляне, але і насельніцтва аддаленых мясцовасцяў.

На тэрыторыі Беларускага Падзвіння кірмаш часта выконваў функцыю сватаўства для маладых людзей. Кірмашовым звычаем з'яўлялася менавіта тое, што дзеля гэтай падзеі яны прыбіраліся ў свае лепшыя сукенкі, каб паказаць сябе з найлепшага боку [11, с.188].

Кірмаш мае таксама традыцыйныя закускі і выпіўку. Паводле крыніц, хлопцы частавалі дзяўчат гарэлкай, пернікамі і г.д. Дзяўчаты ў сваю чаргу частавалі хлопцаў халоднымі закускамі, па большай частцы тоўстымі пшанічнымі блінамі, змяшанымі з кавалачкамі сала, якія прыносілі з хаты. Гарэлка з'яўлялася неад'емнай часткай спачатку храмавых святаў, а пасля і кірмашоў.

Варта таксама згадаць такі феномен, як жабрацтва. Жабракоў, што збіраліся на кірмашах называлі адпаведна – кірмашовыя. Як правіла, яны збіраліся на сельскія кірмашы або на сельскія храмавыя святы, дзе ад шматлікіх наведвальнікаў і багамольцаў яны збіралі міласць. Жабракі, збіраючыся, прасілі міласціну, пры гэтым даволі важным з’яўвецца тое, што рабілі яны гэта выстаўляючы сваю беднасць на паказ. [6, с. 75]. Негледзячы на тое, што сотні жабракоў сцякаліся на кірмашы ў храмавыя святы, яны, як правіла, не захадзілі у царкву. [6, с. 78]. Такім чынам феномен жабрацтва таксама з'яўляецца важнай часткай кірмашовай культуры і своеасаблівым спосабам ўзаемадзеяння збяднелага і пакалечанага пласта насельніцтва з простым людам.

**Кірмаш у структуры гульнёвых дзеянняў.** Як правіла, поспех добрага і выгаднага гандлю заключаецца не толькі ў якасці тавару. У асяроддзі даволі жорсткай канкурэнцыі, асабліва на кірмашах, патэнцыйных пакупнікоў прыцягвалі рэкламай, латарэямі, аўкцыёнамі і іншымі гульнямі.

Рэклама з'яўляецца адным з найважнейшых фактараў, якія ўплываюць на якасць продажаў. У XIX-XX стагоддзях пакупнікоў зазывалі купляць тавар. Зразумела, кожны прадавец спрабаваў расхваліць свой тавар і пераканаць, што менавіта ў яго ён будзе якасней астатніх. Так, на кірмашы ў Вілейцы было зафіксавана, як купец рэкламуе свой клей. Разам з гэтым прадавец наглядна паказвае дзеянне тавару: «Так можна цыраваць мяшкі, адзенне, кашулю ці іншую рэч у гардэробе! Аднаго цюбіка хопіць на год! Варта 30 грошаў, можна сціраць ў халоднай вадзе, і ён будзе трымацца, не пашкодзіць!» [8].

Таксама цікавую інфармацыю могуць даць сюжэты народнай гумарыстыкі, якія захаваліся ў фальклорнай творчасці беларусаў. У тэксце батлеечнага прадстаўлення на Віцебшчыне паказана, як гандляр гарэлкай усхваляе свой тавар прыёмам «ад адваротнага», што таксама камічны характар рэкламе: «А у мяне гарэлка дзяшовая, з мельніцы, з-пад кола, дзе круціўь, муціць, пенай б’ець, назад валакець. Так і таго будзе біць, хто яе будзе піць. Але хто хоча яе піць, трэба грошыкі плаціць» [6 с. 227]. Трэба адзначыць, што гумар, як правіла, грамадствам ўспрымаецца заўсёды станоўча, асабліва калі ён тычыцца іх паўсядзённым жыцці, таму падобная рэклама была вельмі папулярызаванай на кірмашах.

У зборніку «Жарты, анегдоты і гумарэскі» можна сустрэць таксама шмат прыкладаў таго, як купец жадае прадаць свой тавар праз выкарыстанне камічных прыёмаў для прыцягнення пакупніка: «– Купіце выйгрышны білет! – Не трэба, я не хачу выйграць. – Дык я маю такі білет, што нічога не выйграе!» [4, с. 190]. Такім чынам прадаўцы імкнуцца надзяліць тавар не самай лепшай якасці добрымі ўласцівасцямі, якімі ён не валодае, каб выбавіць за яго хаця б нейкія грошы. Гэта звычайная справа, і тое, што яно знайшло сваё адлюстраванне ў рознага кшталту гумарэскам сведчыць аб шырокай распаўсюджанасці дадзенага фенамена.

Падчас кірмашоў вялікую ролю адыгрывае чалавечы фактар, які заключаецца ў тым, што людзі з'яўляюцца па сваёй сутнасці вельмі азартнымі і для таго, каб прыцягнуць большую колькасць пакупнікоў, на кірмашах праводзяцца латарэі - гульні, зыход якіх залежыць ад поспеху гульца. У той жа Вілейцы апісваецца латарэя, падобная на сучасную рулетку, якая складалася з паркалёвага кола. Гульня была дастаткова папулярнай, бо людзі сапраўды выйгравалі [8].

На кірмашах тэрыторыі беларускага Падзвіння былі пашыраны такія атракцыёны, як «Перабродская рыбалка», «Браслаўская рыбалка», «Дзіцячая латарэя-рыбалка», «Павук», «Слуп-кола», «Ледзяны конус» і г.д. [3, с. 74]. Гэта ў значнай ступені садзейнічала збліжэнню людзей, бо ў такіх умовах, калі яны весела бавяць час, ды яшчэ і падпіўшы гарэлкі, чалавек нашмат прыязней ставіцца да іншых (за выключэннем канфліктных сітуацый).

Вялікая варыятыўнасць «Рыбалкі» тлумачыцца фармаваннем тэрытарыяльных асаблівасцяў, якія ўплываюць на гульню. Атракцыён «Перабродская рыбалка» – старадаўні кірмашовы гандлёвы атракцыён у мястэчку Пераброддзе Дзісненскага павета. [3, с.75]. Таксама на тэрыторыі Падзвіння існавал іншыя варыяцыі дадзенага атракцыёна - «Браслаўская рыбалка» і «Рыбалка» для дзяцей. Акрамя вышэйзгаданых гульняў, у Мёрскім раёне была зафіксавана яшчэ адна рыбная забава – «Павук». [3, с.78]. Атракцыён «слуп-кола», даволі падобны на рускі «масленічны слуп», быў даволі шырока распаўсюджаны на Віцебшчыне. [3, с. 80]. Падобнага роду гульні, заснаваныя на фізічных уменнях і здольнасці праявіць сваю сілу, былі досыць папулярныя сярод мужчынскай паловы насельніцтва. Падобную канцэпцыю маў атракцыён «Ледзяны конус», таксама зафіксаваны ў Мёрскім раёне. [3, с. 81]. Задача ўдзельнікаў – разагнаўшыся, узбегчы на конус і ўзяць прыз, але зрабіць гэта таксама вельмі складанна, таму што гульцы ў асноўным скатваюца назад.

Да канца XIX стагоддзя папулярнасць сталі набіраць латарэі і іх пачалі праводзіць на штогодніх святочных таргах Беларусі. У Браслаўскім раёне карысталася папулярнасцю грашовая латарэя, дзе выйгрышы вызначаліся пры дапамозе папугая, які размяркоўваў галантарэйныя тавары: муштукі, грабяні, завушніцы і г.д.) [3, с. 92]. Папулярнасць такога роду гульняў на кірмашах была абумоўлена таксама тым, што бачачы назву «бяспройгрышная латарэя», людзі лічылі выдаткі на гэтыя атракцыёны мэтазгоднымі.

**Кірмашовы тэатр**. У гульнявую праграму кірмашу ўваходзілі так званыя кірмашовыя тэатры – паказы народнага тэатра на кірмашы. Найбольш пашыраны ён быў на тэрыторыі Беларусі ў XVI – пачатку XX ст. Як правіла, тэатр уключаў у сябе выступленні мясцовых і вандроўных скамарохаў, штукароў, павадыроў мядзведзяў, акрабатычныя нумары, а таксама паказы батлейкі. Крыніцы сведчаць аб удзеле ў святочных кірмашовых дзеях «сляпцоўлірнікаў», якія выконвалі рэлігійныя, гістарычныя і жартоўныя песні [5, с.181].

Пачынаючы з XIX стагоддзя, на кірмашах выступалі хары народнай песні і інструментальныя ансамблі, наладжваліся танцавальныя балі, маскарады, феерверкі. Да кірмашоў таксама прымяркоўвалі і тэатральныя Кірмашовыя паказы вандроўных тэатраў адбываліся на тэрыторыі Беларускага Падзвіня ў Оршы.

Песенныя і танцавальныя традыцыі атрымалі яшчэ адну галіну свайго развіцця на кірмашах. Танцавалі звычайна крутуху, бычка, паню, лявоніху, мяцеліцу, а таксама «кадрылю», якую запазычылі ў мясцовай дробнай шляхты. Галоўная вартасць ва ўсіх танцах заключаецца ў плыўнасці рухаў танцуючых, бо асаблівых мудрагелістых фігур не прадугледжвалася. Хлопцы паказвалі сваю ўдаласць моцным прытоптваннем абцасаў у такт музыкі, ламаннем шапкі набакір, размахваннем рукамі, свістам і далёка не сціплага ўтрымання прыпеўкамі [11, с.189].

Важным элементам згуртавання людзей на кірмашы з'яўляюцца кірмашовыя песні – абмежаваныя групы твораў, прымеркаваных да кірмашоў. Жанравай прыкметай гэтых твораў з'яўляюцца паўсядзённыя, сямейна-бытавыя і бяседныя матывы. Умоўна кірмашовыя песні можна падзяліць на тры групы: песні пра падрыхтоўку да кірмашу, таргі на кірмашы і здарэнні пасля кірмашу. Кірмашовыя песні даволі сціплыя з пункту гледжання мастацкасці і вобразнасці, але яны з'яўляюцца прыкметнай з'явай песеннага фальклору беларусаў, а таксама ўключаюць у сябе даволі каштоўную інфармацыю для вывучэння і аналізу.

Немалаважную ролю ў арганізацыі тэатральнага шоў падчас Кірмашу гралі скамарохі, аб удзеле якіх вядома ужо пачынаючы з XVI стагоддзя. Скамароства не было сацыяльна аднародным, з яго асярод-

дзя вылучаліся вандроўныя скамарохі, для якіх адзіным сродкам існавання было іх мастацтва, а таксама – скамарохі аселыя. Сярод творчых прафесій скамарохаў крыніцы згадваюць фокуснікаў, акрабатаў, лялечнікаў, бахароў, павадыроў дрэсіраваных мядзведзяў. [10, с. 118].

Як адзначае П.Шпілеўскі, апісваючы кірамшы, вялікая ўвага надаецца цыганам, якія падарожнічаюць з мядзведзямі. Дрэсіраваныя мядзведзі разыгрывалі камічныя сцэнкі, кланяліся гледачам, танцавалі, ездзілі на палачцы, падавалі шапку і барабан гаспадару і г.д. Жывёлы дазвалялі гледачам дакранацца да іх, падавалі жадаючым лапу і, нават, вазілі на сабе гледачоў [3, с. 82].

Вялікая папулярнасць мядзведжых забаў у XVIII ст. робіць павадыра з мядзведзем пастаянным персанажам лялечнага тэатра «батлейка», які пашырыў сваю папулярнасць на кірмашах [3, с. 293].

Кірмашовая культура з’яўляецца даволі багатай на атрыбуты і сімвалы. З прычыны таго, што частка кірмашу была арыентавана на дзіцячае насельніцтва, цацкі і лялькі сапраўды сталі важным кірмашовым атрыбутам. У XIX ст. беларускія кірмашы звычайна зіхацелі россыпам рознакаляровых забавак для дзяцей. Майстры спецыяльна прывозілі сваю прадукцыю на кірмаш, дзе маглі лёгка яе рэалізаваць. Цацка была вельмі даступнай нават для самых бедных [9, 187 с.]. Таннасць зыходнага матэрыялу, прастата выканання рабілі іх самым жаданым таварам для дзяцей. З-за шматлікасці падобных вырабаў беларускі кірмаш XIX ст. меў не толькі візуальную каларытнасць, але і аўдыяльныя прыкметы: паветра напаўнялася пералівістымі гукамі цацак-свістулек [1, С.42].

Такім чынам, кірмаш выконвае велізарную колькасць функцый пазаэканамічнага прызначэння. Кірмашы спрыялі развіццю сацыяльных адносін паміж людзьмі, рэгламентавалі правілы паводзін паміж імі. Кірмашы з'яўляліся навалай рознага роду атракцыёнаў, гульняў і забаў, а такія мерапрыемствы, у першую чаргу, спрыяюць рэкламаванню тавараў і ўзбагачэнні гандляроў. Атракцыёны на кірмашах упрыгожваюць кірмашовую дзейнасць і прыносяць дадатковую прыбыць. Акрамя ўсяго іншага, кірмаш – месца для выступлення народных тэатраў, хораў народных песень і інструментальных ансамбляў, ажыццяўлення маскарадаў, танцаў і запускам феерверкаў. Вывучэнне кірмашовай культуры спрыяе разуменню не толькі эканамічнай абстаноўкі ў дзяржаве, але і формаў, правілаў паводзін насельніцтва, іх спосабы забавы і камунікацыі адзін з адным, што дае нам найбольш поўную карціну, якая адбывалася ў той рэчаіснасці. Кірмашы таксама спрыяюць людзям розных нацыянальнасцей, якія пражываюць на Беларусі, далучыцца да здабыткаў сваёй нацыянальнай культуры, пагаварыць на роднай мове, паслухаць нацыянальную музыку, паўдзельнічаць у гульнях і забавах.

ЛІТАРАТУРА

1. Андрыеўская, С. Беларускія кірмашовыя забавы і цацкі ў гісторыі і сучаснасці/ С. Андрыеўская // Фалькларыстычныя даследаванні: Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. арт. / рэд.-склад. В. Прыемка. – Мінск: РІВШ, 2018. – С. 54-58.
2. Бурачонак, А. В. Вывучэнне гандлёвых адносін на тэрыторыі Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX ст.: (на матэрыялах «Аглядаў губерняў») / А. В. Бурачонак // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навуковы зборнік / Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. – 2015. – Вып. 10. – С. 180-188
3. Гершельман, Э.Ф. Исторический очерк внутренних водяных сообщений /Э.Ф. Гершельман – СПб.: Тип. Ю. Н. Эрлиха, 1892. – 102 с.
4. Евреи в торговле Беларуси в конце XVIII – начале XX века / Эмануил Иоффе // Гісторыя гандлю ў Беларусі (ад старажытнага часу да канца XX ст.): праблемы вывучэння і перспектывы даследавання : матэрыялы I Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 14-16 лістапада 2013 г.) / [адказны рэдактар З. Шыбека]. – Мінск, 2014. – С. 57-67
5. Касцюкевіч С.У., Семантыка і функцыі традыцыйных цацак беларусаў у XIX-XX стст. / С.У. Касцюкевіч. – Мінск: Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ім. К.Крапівы НАН Беларусі, 2004. – 20 с.
6. Лютый А.М., Социально-экономическое развитие городов Белоруссии в конце в конце XVIII-первой трети XIX в. / А.М.Лютый – Минск: Наука и техника, 1987. – 181 с.
7. Никифоровский Н.Я., Очерки Витебской Белоруссии. Старцы: [в 5 вып.] / Н. Я. Никифоровский. [Вып.] 1: Старцы – Б.м., 1832. – 70-105 с.
8. Пракапцова В.П. Спасціжэнне майстэрства / В.П. Пракапцова. – Мінск: Мінская фабрыка каляровага друку, 2006. – 163 с.
9. Романов, Е.Р. Белорусский сборник. Быт Белоруса / Е. Р. Романов – Вильно: тип. А.Г. Сыркина, 1912. – 730 с.
10. Сахута, Я. М. Народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск: БелЭн, 1997. – 187 с
11. Фядотаў, А. Г. Традыцыі і навацыі ў сучаснай святочнай культуры беларускага горада / А. Г. Фядотаў // Перспектыўныя накірункі фарміравання духоўнай і мастацкай культуры студэнтаў: матэрыялы навуковай канферэнцыі (22-23 красавіка 1998 г.) / Беларускі універсітэт культуры. - Мінск, 2000. - С. 117-120.